УДК351.746.1 (476) (091)

## РАЁННЫЯ АХОЎНЫЯ АДДЗЯЛЕННІ Ў СІСТЭМЕ ПАЛІТЫЧНАГА ВЫШУКУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Бусько Сяргей Іванавіч
дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры»;
кандыдат гістарычных навук
(г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны адной з малавядомых структур палітычнай паліцыі Расійскай імперыі – раённым ахоўным аддзяленням, што існавалі ў 1906-1913 гг. Адзначаецца іх выключная эфектыўная роля ў барацьбе з антыўрадавым рухам. Зроблена высновa, што іх неабгрунтаваны роспуск стаў адной з прычын рэвалюцыі ў лютым 1917 г.*

Адначасова з дзейнасцю па стварэнню і ўмацаванню ахоўных аддзяленняў у сістэме палітычнага вышуку ўзнікаюць прынцыпова новыя ўстановы – Раённыя ахоўныя аддзяленні (РАА). 14 снежня 1906 г. П.А. Сталыпін зацвярджае спецыяльнае Палажэнне аб Раённых ахоўных аддзяленнях. Яны ствараліся з мэтай «успешной борьбы с революционным движением, выражающимся в целом ряде непрерывно продолжающихся террористических актов, аграрных беспорядков, усиленной пропаганды среди крестьян, в войсках и во флоте» [1, с. 165]. На іх ускладалася задача аб'яднання ўсіх органаў палітычнага вышуку ў межах пэўнага раёну (які ахопліваў некалькі губерняў). Увядзенне РАА з аднаго боку дэцэнтралізавала агульнаімперскую сістэму палітычнага вышуку, з іншага – павінна было сістэматызаваць гэту дзейнасць у адпаведных рэгіёнах. Значная ўвага была нададзена веданню абставін на месцах, прыняццю хуткіх рашэнняў, сумеснай рабоце ахоўных аддзяленняў (АА) і губернскіх жандарскіх упраўленняў (ГЖУ).

Адметна, што Раённыя ахоўныя аддзяленні былі арганізаваны такім чынам, каб сфера іх дзейнасці супадала з раёнамі дзейнасці акруговых партыйных камітэтаў рэвалюцыйных партый. Інакш кажучы, гэта была спроба суаднесці геаграфічныя межы дзеяння палітычнай паліцыі Расійскай імперыі з адпаведнай тэрыторыяй антыўрадавых арганізацый. У цыркуляры № 207 ад 8 студзеня 1907 г. за подпісам П.А. Сталыпіна аб стварэнні РАА адзначалася: «Мною признано необходимым существенно изменить постановку политического расследования и создать в Империи несколько центральных розыскных учреждений, предоставив им сосредоточение в своих руках данных агентурного и наружного наблюдения по крупным административным районам, и руководство работой местных учреждений, причем объединяющим и направляющим центром явится, по-прежнему, Департамент полиции» [2, с. 123].

Першапачаткова было створана 8 РАА, сярод іх 3 ахоплівалі ўкраінскія губерні (Паўднёва-Ўсходняе, Паўднёва-Заходняе і Паўднёвае), 3 размяшчаліся ў еўрапейскай частцы Расіі (Паўночнае, Цэнтральнае і Паволжскае), адно ў Прыбалтыцы (Прыбалтыйскае) і апошняе ўключала этнічныя беларускія губерні (Паўночна-Заходняе). Кіраўніцтва РАА сумяшчалася з пасадай кіраўніка мясцовага ахоўнага аддзялення. Так было і ў Вільна. ГЖУ, жандарскія ўпраўленні на чыгунках, жандарскія крапасныя каманды, мясцовыя АА і пункты па пытаннях палітычынага вышуку павінны былі падпарадкоўвацца начальніку РАА. Паўночна-Заходняе раённае ахоўнае аддзяленне ўключала тэрыторыю сямі губерняў: Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, а таксама Ковенскай і Смаленскай. У красавіку 1909 г. было ліквідавана Віленскае (гарадское) ахоўнае аддзяленне, а усе справы перададзены ў адпаведнае РАА [3, арк.32].

У перыяд 1908–1910 гг. шэрагам цыркуляраў ажыццяўлялася пераразмеркаванне паветаў і губерняў, уваходзіўшых у РАА. Знішчэнне рэвалюцыйных арганізацый зрабіла непатрэбным партыйны крытэрый пры тэрытарыльным падзеле губерняў паміж РАА. Адпаведна адбывалася і пераразмеркаванне тэрыторый. Як прыклад, у сакавіку 1909 г. Смаленская губерня была пераведзена са складу Паўночна-Заходняга ў Цэнтральнае РАА [3, арк. 40]

Асноўнай задачай РАА з'яўляліся арганізацыя ўнутраннай агентуры для «распрацоўкі» мясцовых партыйных арганізацый і кіраўніцтва дзейнасцю агентуры і палітычнага вышуку ў межах раёну. З гэтай мэтай кіраўнікі РАА мелі права склікаць нарады афіцэраў, непасрэдна ажыццяўляючых палітычны вышук. Яны таксама павінны былі інфармаваць цэнтальныя паліцэйскія ўстановы аб стане рэвалюцыйнага руху ў рэгіёне.Патрабаванні кіраўніка РАА аб вобысках і арыштах былі абавязковымі для органаў палітычнай і агульнай паліцыі, афіцэры РАА мелі права карыстацца ўсімі следчымі і агентурнымі матэрыяламі ГЖУ і ахоўных аддзяленняў. Пры неабходнасці ім маглі быць вядомы і сакрэтныя супрацоўнікі – агенты, што былі замацаваны за тэрытарыяльнымі ўпраўленнямі. Ахранкі і ГЖУ прадстаўлялі ў РАА ўсе агентурныя звесткі, на падставе якіх там складаліся агульныя агляды і для Асобага Аддзелу Дэпартаменту паліцыі. Калі агентурныя звесткі тычыліся не толькі тэрыторыі аднаго РАА, але і іншых губерняў Расійскай імперыі, то інфармацыя дасылалася і ў Дэпартамент, і ў суседнія раёны. РАА не замянялі мясцовыя органы, а накіроўвалі іх дзейнасць. Адначасова яны не выконвалі функцыі Дэпартамента паліцыі, а толькі забяспечвалі больш аператыўнае ажыццяўленне палітычнага вышуку.

У асноўным кіраўнікамі РАА, як і ахоўных аддзяленняў, прызначаліся «маладыя» жандары ў чыне ротмістра, што атрымалі адпаведную падрыхтоўку ў справе палітычнага вышуку. Відавочна, што такі падыход не выклікаў энтузіязму ў прадстаўнікоў «старой» школы – большасці кіраўнікоў ГЖУ ці ЖПУ на чыгунках. Дырэктар Дэпартамента паліцыі пісаў: «…каждое преданное престолу и отечеству правительственное лицо должно забыть свои вытекающие из табели о рангах преимущества, когда существеннейшие интересы России вызывают необходимость принимать к руководству указания служебного опыта лиц, хотя и ниже стоящих в чинах, но специально подготовленных в данном деле. Рутина и споры из-за формальных условий дела ныне неуместны и должны уступить место живой работе и простору для способностей и энергии» [2, с. 129]. Але ў рэальных умовах вельмі складана было генералу ў сталым узросце падпарадкавацца ротмістру.

Ускладняў сітуацыю § 39 Палажэння аб ахоўных адзяленнях. Ён не даваў кіраўнікам ахоўных аадзяленняў права на арышт, яны павінны былі прадстаўляць кіраўніку тэрытарыяльнага жандарскага ўпраўлення спіс падазроных асоб з тлумачальнай запіскай для зацвярджэння. Аднак на практыцы такое імкненне да законнасці мела негатыўныя вынікі. У выпадку добрых асабістых адносін паміж згаданымі афіцэрамі кіраўнік РАА меў загадзя падпісаны чысты бланк, у іншых выпадках гэтае правіла давала магчымасць кіраўніку ГЖУ «паставіць на месца канкурэнта» з ахранкі [4, с. 180].

На першым этапе сваёй дзейнасці РАА адыгралі немалаважную ролю ў разгроме партыйных арганізацый і камітэтаў, каардынацыі дзейнасці вышуковых устаноў на мясцовым



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

узроўні. Іх поспехі ўмацавалі прэстыж вышуковай працы сярод вышэйшых чыноў Дэпартамента паліцыі і Міністэрства ўнутраных спраў, стварылі бачнасць магчымага разгрому рэвалюцыйных арганізацый. У красавіку 1908 г. адбыўся Першы з'езд кіраўнікоў РАА – 23 лепшыя афіцэры пад кіраўніцтвам дырэктараДэпартамента паліцыі М.Трусевіча сабраліся для абмеркавання асноўных праблем палітычнага вышуку і абмену вопытам. Беларускія губерні прадстаўляў падпалкоўнік К.М. Шыбека. Эфектыўнасць новых устаноў была высока ацэнена [1, с. 162]. З 1909 г. дзейнасць РАА становіцца менш актыўнай, што ў пэўнай ступені было звязана з агульнарасійскім крызісам ў рэвалюцыйных арганізацыях.

У 1913 г. да кіраўніцтва Дэпартамента прыходзіць менавіта тая частка жандарскіх афіцэраў, якая з самага пачатку адмоўна ставілася да рэформ. Больш за тое, сама асоба новага Шэфа жандараў – генерала Джункоўскага была, на нашу думку, самым горшым варыянтам пры абранні кіраўніка Корпусу жандараў. Ён – афіцэр-ідэаліст, які з добрых намераў знішчыў пабудаваную сістэму палітычнага вышуку, забараніў агентуру ў навучальных установах і арміі, адмовіўся ад перлюстрацыі. Ім ставілася пытанне аб мэтазгоднасці далейшага існавання як ахоўных аддзяленняў, так і РАА. Пачынаецца працэс іх ліквідацыі ў тых рэгіёнах, дзе па дадзеных Дэпартаментапаліцыі адсутнічаў значны рэвалюцыйны рух. Тут не ставіцца пад сумненне неабходнасць аб'яднання вышуку і правядзення дазнанняў па палітычных справах у адну структуру, але зроблена гэта было няправільна. Палітычны вышук у губернях узначалілі кіраўнікі ГЖУ, прафесійная падрыхтаванасць у справах вышуку ў гэты час, як адзначалася вышэй, была невысокая. У якасці першага аргументу на карысць рэарганізацыі палітычнай паліцыі Джункоўскі адзначыў: «… начальниками же управлений были уже немолодые полковники, генерал-майоры… не всегда безупречные, но с известным стажем. Самолюбие их было сильно задето…» [5, с. 217]. Такім чынам, крытэрыем з'яўляўся не прафесіяналізм кіраўніка, а выслуга гадоў! Пазіцыя Джункоўскага ў ацэнцы ахоўных аддзяленняў была вельмі простай і непрафесіянальнай: «Все эти районные и самостоятельные Охранные отделения были только рассадниками провокации; та небольшая польза, которую они, быть может, смогли бы принести, совершенно затушевывалась тем колоссальным вредом, который они сеяли в течение этих нескольких лет» [5, с. 218]. Такія абвінавачанні выклікалі негатыўны водгук сярод часткі жандараў.

15 мая 1913 г. за подпісам Джункоўскага быў выдадзены цыркуляр, якім кіраўнікі ГЖУ былі праінфармаваны аб ліквідацыі ахоўных аддзяленняў у іх губернях, адзначалася: «в связи с проявлениями революционного движения и принимая во внимание, что охранные отделения, кроме учрежденных в законодательном порядке, рассматривались, как учреждения временные, я признал целесообразным, в видах достижения единообразия розыскного дела и руководительства им, влить и оставшиеся самостоятельные охранные отделения в составы местных ГЖУ» [6, арк. 453]. Усе кіраўнікі ліквідаваных ахранак станавіліся на чале ізноў створаных вышуковых аддзелаў (частак) ГЖУ.

Пасля ліквідацыі ахранак У.Ф.Джункоўскі падрыхтаваў праект па расфарміраванню РАА. Загадам па ДП 22 лютага1914 г. усе яны былі зачынены, засталіся толькі: Туркестанскае, Каўказкае, Усходнесібірскае. З гэтага моманту і да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. цэнтральнымі ўстановамі палітычнага вышуку ў беларускіх губернях (як і па ўсёй Расійскай імперыі) становяцца, як і раней, губернскія жандарскія ўпраўленні. Дасягнуць прафесійных поспехаў перыяду 1910-1913 гг. палітычная паліцыя больш не здолела.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Агентурная работа политической полиции Российской империи : сборник документов, 1880–1917 // Ассоциация исследователей российского общества, Академия ФСБ России; сост. Е. И. Щербакова. – Москва : АИРО-XXI; СПб. : Дмитрий Буланин, 2006. – 377 с.
2. Перегудова, З. И. Политическая полиция Российской империи (1880-1917) / З. И. Перегудова ; Гос. арх. Рос. Федерации. – М. : РОССПЭН, 2000. – 430 с.
3. Циркуляры Департамента полиции о порядке наблюдения за деятельностью революционных организаций // Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДА РФ). – Фонд. 267. – Воп. 1. – Спр. 31.
4. Мартынов, А. П. Моя служба в Отдельном Корпусе жандармов / А. П. Мартынов // Охранка: Воспоминания руководителей политического сыска / под общ. ред. З. И. Перегудовой. – М. : Новое литературное обозрение, 2004. – Т. 1. – С. 29–408.
5. Джунковский, В.Ф. Воспоминания : в 2 т. / В. Ф. Джунковский ; под общ. ред. А. Л. Паниной. – М. : Изд-во им. Сабашниковых, 1997. – Т. 2. – 685 с.
6. Циркуляры Департамента полиции и Отдельного Корпуса жандармов о работе губернских жандармских управлений // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 366. – Воп. 1. – Спр. 83.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова